Паглядзіце Вятку. Памятаеш, Лялячка, як ты пыталася: „А дзе Вяцкая губэрнія?“ Ці спадабаецца яна Вам? Прыяжджайце.

Цалую цябе моцна.

Твой *бацік*.

## № 98. Язэпу Пушчу

*[10.03.]1935 г.*

Дарагі Язэп!

Тваю лістоўку атрымаў і быў вельмі рад. Думалася, мо' ўжо ў іншым дзе месьце і ты, аж мінула ваш край гэтая „чаша“ перакідак. Гэта й лепш. А то вось я цяпер тут, а сям'я на старым месьце — на два дамы даводзіцца жыць. І ня ведаю, што й рабіць. Ці перабірацца сям'і сюды, як скончацца ў Ані заняткі ў школе, ці то ўжо дабываць тут аднаму, а рушыць ужо з Слабадзкога, таксама, як і ты мяркуеш, куды–небудзь у цяплейшы край. З кватэрамі тут труднавата, я ўсё яшчэ жыву ў падсуседзях у Антося. Хутчэй за ўсё, што давядзецца дабываць тут аднаму, а там, як льга будзе рушыць ужо з Слабадзкога. Месца, куды б пераехаць потым, яшчэ ня вызначылі мы сабе. Вельмі добра было б, каб выбраць нам разам куды. Ці назначыў ужо ты сабе якую мясьціну? Як ты ўважаеш пра Паўночны Каўказ ці Азова–Чарнаморскі край, каб дзе–небудзь на бераг Чорнага мора? Мае дзеці дык даўно ўжо мараць пра мора і вельмі ж чакаюць таго часу, калі можна будзе туды паехаць. Яны павінны былі напісаць Галі і Лялі ліст і картку разам паслаць. Меўся я сам быць у іх мінулым выходным днём, дык шэфства не дазволіла паехаць. У лісьце ж яны пісалі, што паслалі яны ліст і картку 4.III. — тут у нас адзін ужо скончыў свой тэрмін і атрымаў пашпарт (трохгадовы). Калі ведаеш яго — Дунько гэта. На чарзе ідзе Нічыпар, у яго канчаецца тэрмін у канцы сакавіка. Што Нікан[овіч] у Сьвярдлоўску — гэта была навіна, як тое, што *[радок абарваны]*. Лукаш у Ірбіце цяпер бяз працы. *[абарвана]* колькі ўрыўкаў сваіх цяперашні[х твораў], *[абарвана]* напісаць да цябе. Фэлька ў Мінусінску адбывае „пяцігодку“ разам з Карачуном і Рагачэўскім. Уладзіка перакінулі ў Чабаксары. Працуе ў патрэбсаюзе ці нешта накшталт гэтага. Пераехала да яго і Марыля. Язэп, ці пішаш ты што гэтым часам? Уладзік крыху пісаў. Максім Г[арэцкі] дык і шмат, пробаваў пасылаць да друку, але дарэмна. Гэтым часам чытаем з Антосем Шапенгаўэра. Праўда, пакрысе, бо за работаю і сьвету ня відно. Дрэнь гэта бухгалт[арская] работа. Наступным разам буду ліст пісаць ужо, а то ня тоўпіцца ў лістоўцы. Моцна цалую цябе і вітаю сям'ю.

*Адам.*

## № 99. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*12 сакавіка 1935 г.*

Дарагія і любыя Аня, Лора і Ляля!

Сёньня прышла лістоўка ад Ігнася. Піша, што дзеці і бабуля хварэлі, але цяпер ужо папапраўляліся крыху. Працуе ён у калгасе, возіць малако ў Сьвінку. Думае ўсё, каб куды пераехаць з Слабодкі. У партыі яго не аднавілі. Слабодка, піша, расьце, шмат новых будынкаў паставілі. Атрымалі яны на працадзень 1,8 кгр. збожжа